ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык
дзяржаўнай установы
“Лельчыцкі раённы
вучэбна-метадычны кабінет”
__________________В.М. Жураўлёва

“____” ____________ 2023

**Заданні першага этапу**
**абласной алімпіяды па вучэбных прадметах**
**“Беларуская мова і літаратура”**
**2022/2023 навучальны год,**
**5 клас**

1. **Колькі звонкіх (парных) зычных гукаў у наступных словах? Пастаўце адпаведную лічбу.**

| | | |
|---|---|---|
| Цуда - | Гарбуз – | Раз’езджаны – |
| Лічба - | Дождж – | Знаходка – |
| Жолуд - | Жаніцьба – | Падказка – |
| Абход - | Завадзь - | Просьба - |

2. **Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф.**

| | | |
|---|---|---|
| З..бірал..нік | Здароў..е | Сям’я |
| Дзевяц..сот | Надвор..е | Камус..ці |
| Дз..весце | Свежас..ц.. | Радас..цю |
| Мен..шы | Дз…веры | Мядз..ведз.. |

3. **Выберыце і падкрэсліце тое слова, якое ўжываецца ў фразеалагічным звароце.**

1.(Браць, хапаць) сябе ў рукі.
2.Падмазваць (пяткі, ногі)
3.Замятаць (сляды, крокі)
4.(Вылузвацца, выходзіць) са скуры
5.(Прыкусіць, прышчаміць) язык
6.(Ранняя, ранішняя) птушка

4. **Пастаўце націскі ў словах.**

| | | |
|---|---|---|
| Алфавіт | Адзінаццаць | Вусы |
| Маленькі | Магазін | Некаторыя |
| Спіна | Кіламетр | Крапіва |
| Стары | Рэмень | Навіна |

5. **Перакладзіце выразы на беларускую мову адным словам.**
1. Вопросительный знак –
2. Березовый сок –
3. Белый гриб –
4. Печная труба –
5. Восклицательный знак –
6. Кукурузный початок –

6. **Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы.**
1. Еш капусту з грыбамі, трымай _________ за зубамі.
2. Нікому _________ не завяжаш.
3. Не сунь ________ ў чужое проса.
4. Міл жабе арэх, ды __________ Бог не даў.
5. Хто з _________, той з піражком.

7. **Злучыце стрэлкамі назвы сінтаксічных адзінак.**

| | |
|---|---|
| 1.Словазлучэнне | 1.Многа прыгожых куткоў ёсць у беларускім краі. |
| 2.Просты развіты сказ | 2.Снег шчыльна ўкрывае сонную зямлю белым пакрывалам, але лес жыве. |
| 3.Просты неразвіты сказ | 3.Знаходзіцца каля школы. |
| 4.Складаны сказ | 4.Сонца свеціць, ды не грэе. |

8. **Зрабіцце марфемны разбор слоў:**

Вяснянкі
Бусляняты
Вартаўнік
Прыдняпроўскіх
Рыбінка

9. **Пададзены прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Замест пропускаў запішыце іх імены.**

___________ Колас

___________ Багдановіч

___________ Караткевіч

___________ Броўка

___________ Янішчыц

___________ Танк

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык
дзяржаўнай установы
“Лельчыцкі раённы
вучэбна-метадычны кабінет”
__________________В.М. Жураўлёва

“____” ____________ 2023

**Заданні першага этапу**
**абласной алімпіяды па вучэбных прадметах**
**“Беларуская мова і літаратура”**
**2022/2023 навучальны год,**
**6 клас**

**1. Прачытайце тэкст. Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце стыль і тып тэксту. Падкрэсліце сказ, у якім выражана асноўная думка тэксту.**

Многімі стагоддзямі складвалася шліфавалася і ўзбагачалася беларуская мова на нашай зямлі. Тысячы і тысячы людзей слоўца да слоўца гук да гука песню да песні збіралі і зберагалі гэты неацэнны скарб. І кожнае пакаленне імкнулася дабавіць да яго штосьці сваё дарагое вартае доўгай памяці. Мільёны прыходзілі ў гэты свет і пакідалі яго з матчыным словам на вуснах. І сёння мы не можам не памятаць гэтага не можам абразіць жыццё надзеі мудрасць і запавет нашых продкаў.

(Паводле Генадзя Бураўкіна)

Стыль ________________________________________

Тып ___________________________________________

**2. Выпішыце з тэксту па два словы, якія адносяцца да названых арфаграм. Сфармулюйце арфаграфічнае правіла.**

1) правапіс у – ў:

______________________________________________________

Правіла:______________________________________________

______________________________________________________

______________________________________________________

2) правапіс д – дз, т – ц:

______________________________________________________

Правіла:______________________________________________

______________________________________________________

______________________________________________________

3)правапіс о, э, а:

________________________________________________________________

Правіла:__________________________________________________________

__________________________________________________________

__________________________________________________________

4) правапіс падоўжаных зычных:

_______________________________________________________________

Правіла:__________________________________________________________

__________________________________________________________

__________________________________________________________

**3. Знайдзіце і выпішыце з тэксту першага задання прапанаваныя словы.**

2 словы, у якіх усе зычныя гукі звонкія:________________________________

_________________________________________________________________

2 словы, у якіх усе зычныя гукі глухія:

________________________________

_________________________________________________________________

2 словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае: ______________________

_________________________________________________________________

**4. Перакладзіце на беларускую мову.**

Вежлывый официант_____________________________

Тихий океан____________________________________

специальный рейс_______________________________

авиационный завод______________________________

биограф Купалы_________________________________

диапазон голоса_________________________________

**5. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх марфемным складам.**

| | |
|---|---|
| А. Заблытаць | 1. Корань, канчатак |
| Б. Багаж | 2. Корань, суфікс, суфікс |
| В. Прыдарожны | 3. Корань, суфікс, канчатак |
| Г. Хадзіць | 4. Прыстаўка, корань, суфікс, суфікс |
| Д. Ветрык | 5. Прыстаўка, корань, суфікс, канчатак |

Адказ: А__ Б __ В __ Г __ Д __

**6. Адзначце беларускія прыказкі, значэнне якіх адпавядае рускамоўнаму выслоўю “На вкус и на цвет товарищей нет». Запішыце нумары гэтых прыказак.**

1. Дзеду міла, а ўнуку гніла.
2. Як няма мяса, то і грыб закраса.
3. Каму – як балота, а каму – як золата.
4. Не памогуць і чары, як каму хто не да пары.
5. Хто любіць гарбуз, а хто агуркі.

Адказ: _____________

**7. Адзначце нумары словазлучэнняў.**

1) густы лес
2) хавацца ў лесе
3) лясы і балоты
4) высякаць лес
5) за лесам
6) растуць лясы
7) ісці лесам.

Адказ: _____________

**8. Суаднясіце ўстарэлыя словы да адпаведных сучасных слоў.**

Лемантар________________, сеча_________________,
ланіта_________________, нагалосак___________________,
чало______________, вакацыі________________,
чада_______________, перст_________________

*Словы-адпаведнікі: шчака, палец,буквар, канікулы,дзіця, лоб,бітва, націск.*

**9. Суаднясіце паміж сабой літаратурны жанр і мастацкі твор:**

| | |
|---|---|
| А.“Лебядзіны скіт” | 1. літаратурная песня |
| Б.“Жураўлі на Палессе ляцяць” | 2. верш |
| В.“Сябры” | 3.казка-легенда |
| Г.“Спелы бор” | 4.аповесць |
| Д.“ Насцечка” | 5.апавяданне |

Адказ:_А___Б____В____Г_____Д_____

**10. Літаратурны калейдаскоп.**

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| 1. Укажыце аўтара твора “Лебядзіны скіт” | |
| Якая міфічная істота з’яўляецца поўнаўладным гаспадаром чалавечага жытла? | |
| Укажыце месяц святкавання свята Каляды | |
| | |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык
дзяржаўнай установы
"Лельчыцкі раённы
вучэбна-метадычны кабінет"
_________________В.М. Жураўлёва

"____" ____________ 2023

**Заданні першага этапу**
**абласной алімпіяды па вучэбных прадметах**
**"Беларуская мова і літаратура"**
**2022/2023 навучальны год,**
**7 клас**

**1. Адзначце дзеепрыметнікі з суфіксам – н-.**

А) Прыбраны
Б) Прывезены
В) Вырашаная ( праблема)
Г) Засеяны
Д) Асветлены
Е) Сарваны

**2.Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў.**

А) Слухаючы прамову, узнікаюць недарэчныя думкі
Б) Развітаўшыся, мужчыны разышліся ў розныя бакі.
В) Бацька з сынам, спакойна размаўляўшы, селі за стол.
Г) Пакінулі Мінск, так і не знайшоўшы ў ім шчасця.

**3. Раскрыйце дужкі і запішыце лічбы словамі.**

Цеплаход з 725 (пасажыр)
______________________________________________________________________
____________________________________________________________

Ад 896   адняць287
______________________________________________________________________
____________________________________________________________

для 539 (школьнік)
______________________________________________________________________
____________________________________________________________

50 (год) юбілей
______________________________________________________________________
_______________________________________________________________

**4. Пастаўце ў форме творнага склону словазлучэнні:**

горад Рагачоў_____________________________________
пісьменнік Лужанін____________________________________
горад Шчучын________________________________________
паэт Куляшоў___________________________________________

**5. Разбярыце па саставу выдзеленыя словы.**

За ***спакоем*** тваім ***сонейка майскае радасна сочыць***.

____________________ ____________________ ____________________

____________________ ____________________

**6.Растлумачце фразеалагізмы адным словам. Прыдумайце і запішыце 2 сказы, выкарыстаўшы прапанаваныя фразеалагізмы.**

Кляваць носам________________________________________________
чытаць натацыю______________________________________________
зарубіць на носе_______________________________________________
блытацца пад нагамі___________________________________________
будаваць паветраныя замкі_____________________________________
выкідваць штукі.______________________________________________
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________

**7. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.**

Благодарить друга – ______________________________________
Насмехаться над соседом –_________________________________
Сходить за хлебом – _______________________________________
Старше брата-_____________________________________________
Болеть гриппом –__________________________________________
Жениться на возлюбленной –_________________________________

**8. Затранскрыбіруйце словы:**

Сцежка____________________ бясшумна_____________________
малацьба_________________ гарадскі______________________
усміхаецца__________________ лье________________

**9. Прачытайце тэкст, расстаўце знакі прыпынку. Вызначце тып і стыль.**

На шырокай паляне акружанай з трох бакоў лесам маляўнічым парадкам стаяла шэсць хат. Самая крайняя ад поля хата была новая і нясканчаная. Спарыш і трыпутнік буялі навокал гэтай неабжытай будыніны. Гэтая расліннасць мокрая і прыціснутая восеньскім холадам усё яшчэ гусцілася і ўпарта зеленелася. Ганка пры новай хаце з забітымі вокнамі таксама не было. Парог у сенцы быў высокі падмуроўка была зроблена з роўна складзенага вялікага камення замацаванага цэментам і абсыпанага жвірам.

Тып______________________________________________
Стыль____________________________________________

**10. Знайдзіце адпаведнасці. Запішыце адказ пры дапамозе шыфра " літара - лічба".**

А). "Незагойная рана" 1) Я.Маўр
Б). "Дзеравеншчына" 2) В.Быкаў
В) "Сірочы хлеб" 3) Я.Колас
Г) " Палескія рабінзоны" 4) Я.Брыль

Адказ: А_____Б_____В_____Г_____

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык
дзяржаўнай установы
“Лельчыцкі раённы
вучэбна-метадычны кабінет”
_________________В.М. Жураўлёва

“____” ____________ 2023

**Заданні першага этапу**
**абласной алімпіяды па вучэбных прадметах**
**“Беларуская мова і літаратура”**
**2022/2023 навучальны год,**
**8 клас**

**Заданне 1. Узнавіце па транскрыпцыі словы і запішыце іх**
[л'уцк'і], [с'ац'ц'э], [шшыц'], [роўн'ац'], [адйажджац'], [м'іл'йарт], [з'з'ан'н'э], [каўкаск'і], [з'й'эс'ц'і] , [рэз'эрор], [дз'муц'], [л'йу]

**Заданне 2. Пастаўце націск у словах**
Блытаніна, наспех, упрысядкі, цэмент, супавы, пурпур, выпадак, дасыта.

**Заданне 3. Выпраўце, дзе трэба, маўленчыя і граматычныя памылкі**
Пайсці за грыбамі, хворы грыпам, паўтара нормы, ліпа вышэй бярозы, маладая сяржант Свірыдава, двое жанчын, тры сёмых, ажына смачнейшая малін, высокая канопля, гуляць па лесу, бачыць уласнымі вачамі, нібы з гуся вада, дыма без агня не бывае.

**Заданне 4. Устаўце прапушчаныя літары**
Ар..шт, ц..р..монія, ж..стыкуляцыя, п'ед..стал, антр..соль, поч..рк, выкр..сліць (слова), в..семсот, м..лагучны, сув..нір, ш..рсцяны, абар..ген, р..дкалессе, р..дкаваты, м..такрос.

**Заданне 5. Да фразеалагізмаў падбярыце адпаведныя па сэнсе прыслоўі**

| | |
|---|---|
| 1) на скорую руку | 2) не сёння - заўтра |
| 3) па самае горла | 4) супраць шэрсці |
| 5) на адзін зуб | 6) на адной назе |
| 7) на горкі яблык | 8) нага за нагу |
| 9) нішто сабе | 10) слова ў слова |

**Заданне 6. Адзначце словы, якія пішуцца разам**
а) (Не) абдуманы адказ
б) (Не) дапісаны радок
в) (Не) засеянае жытам поле
г) Мне (не) здаровіцца
д) (Не) акрэслены час

е) (Не) асушанае балота
ж) (Не) напісанае мною сачыненне
з) Карціна (не) намалявана
і) (Не) куплены, а зроблены сваімі рукамі
к) Бабуля пачала (не) дабачваць

**Заданне 7. Напішы па-беларуску назвы ягад**

| | |
|---|---|
| Брусника - | Боярышник - |
| Земляника - | Смородина – |
| Клюква - | Черника - |

**Заданне 8. Адзначце, у якіх сказах правільна падкрэслены дзейнікі (3б.):**

1.Пераражытае часта вяртаецца да нас у снах.
2.Добрая птушка бусел.
3.Уменне слухаць - няпростая справа.
4.Дзед з унукамі пайшлі да возера.
5.Няхай кожны з прысутных напіша колькі слоў.
6.Пасля трэцяга ўрока ўся школа выйшла на лінейку.

**Заданне 9. Запоўніце табліцу**

| Псеўданім | Імя і прозвішча пісьменніка |
|---|---|
| *Янка Купала* | |
| *Якуб Колас* | |
| *Кандрат Крапіва* | |
| *Цётка* | |

**Заданне 10. Злучыце назвы класічных жанраў з назвамі твораў і іх аўтарамі:**

| | |
|---|---|
| 1.Актава | а) М.Багдановіч “Зорка Венера…” |
| 2.Трыялет | б) М.Багдановіч “Замерзла ноччу шпаркая крыніца” |
| 3.Санет | в) Д.Бічэль “Падаюць сняжынкі ў цішы…” |
| 4.Раманс | г) А.Грачанікаў “Свяці, кахання чыстая зара!” |

# АДКАЗЫ 5 клас

**Максімальная колькасць балаў – 50 б.**

**Заданне 1. За кожны правільны адказ 0,5б. (6б.)**

| | | |
|---|---|---|
| Цуда 1 | Гарбуз 2 | Раз’езджаны 3 |
| Лічба 2 | Дождж 1 | Знаходка 1 |
| Жолуд 1 | Жаніцьба 3 | Падказка 0 |
| Абход 0 | Завадзь 1 | Просьба 2 |

**Заданне 2. За кожны правільны адказ 0,5б. (6б.)**

| | | |
|---|---|---|
| Збіральнік | Здароўе | Сям’я |
| Дзевяцьсот | Надвор’е | Камусьці |
| Дзвесце | Свежасць | Радасцю |
| Меншы | дзверы | мядзведзь |

**Заданне 3. За кожны правільны адказ 1б. (6б.)**

1. Браць
2. Пяткі
3. Сляды
4. Вылузвацца
5. Прыкусіць
6. Ранняя

**Заданне 4.** За кожны правільны адказ 0, 5б. (6б.)

| | | |
|---|---|---|
| Алфавіт | Адзінаццаць | Вусы |
| Маленькі | Магазін | Некаторыя |
| Спіна | Кіламетр | Крапіва |
| Стары | Рэмень | Навіна |

**Заданне 5. За адзін правільны адказ 1б. (6б.)**

1. Пытальнік
2. Бярозавік
3. Баравік
4. Комін
5. Клічнік
6. Кіях

**Заданне 6. За кожны правільны адказ 1б. (5б.)**

1. Язык
2. Рота
3. Носа
4. Зубоў
5. Языком

**Заданне 7. За кожны правільны адказ 1б. (4б.)**

1-3
2-1
3-4
4-2

**Заданне 8. За кожнае слова 1 б. (5б.)**

Вяснянкі - вясн – ян – к – і
Бусляняты - бусл – ян - ят - ы
Вартаўнік - варт – аў – нік
Прыдняпроўскіх - пры – дняпр – оў – ск – іх
Рыбінка - рыб - ін – к – а

**Заданне 9. За кожны правільны адказ – 1б. (6б.)**

Якуб
Максім
Уладзімір
Пятрусь
Яўгенія
Максім

**Адказы 6 клас**

***Усяго 50 балаў.***
***Пры выкананні заданняў за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.***

**Заданне 1.Максімальная колькасць балаў – 7; 0,5 б. за кожную пунктаграму (усяго 4 б.); па 1 б. за правільна вызначаныя стыль, тып і асноўную думку тэксту.**

Многімі стагоддзямі складвалася, шліфавалася і ўзбагачалася беларуская мова на нашай зямлі. Тысячы і тысячы людзей слоўца да слоўца, гук да гука, песню да песні збіралі і зберагалі гэты неацэнны скарб. І кожнае пакаленне імкнулася дабавіць да яго штосьці сваё, дарагое, вартае доўгай памяці. Мільёны прыходзілі ў гэты свет і пакідалі яго з матчыным словам на вуснах. І сёння мы не можам не памятаць гэтага, не можам абразіць жыццё, надзеі, мудрасць і запавет нашых продкаў. (Паводле Генадзя Бураўкіна)
Галоўная думка заключаецца ў апошнім сказе. Стыль публіцыстычны. Тып – разважанне.

**Заданне 2. Максімальная колькасць балаў – 10; 0,5 б. за кожную пару слоў; 2 б. за кожнае сфармуляванае правіла.**

1) правапіс у – ў: і ўзбагачалася, слоўца, продкаў…
2) правапіс д – дз, т – ц: людзей, стагоддзямі, памяці, жыццё…
3) правапіс о, э, а: многімі, стагоддзямі, слоўца, прыходзілі…
4) правапіс падоўжаных зычных: стагоддзе, пакаленне, жыццё …

**Заданне 3.Максімальная колькасць балаў – 6б.**

2 словы, у якіх усе зычныя гукі звонкія: многімі, мова, зямлі, людзей, збіралі, зберагалі, яго, дарагое, доўгай, мільёны, мы, можам, надзеі;
2 словы, у якіх усе зычныя гукі глухія: тысячы, штосьці;
2 словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае: стагоддзямі, беларуская, людзей, неацэнны, кожнае, пакаленне, дабавіць, яго, штосьці, сваё, дарагое, вартае, прыходзілі, матчыным, сёння, памятаць, абразіць, жыццё, мудрасць.

**Заданне 4. Максімальная колькасць балаў- 3б.**

Вежливый официант – ветлівы афіцыянт,Тихий океан – Ціхі акіян, специальный рейс – спецыяльны рэйс, авиационный завод – авіяцыйны завод, биограф Купалы – біёграф Купалы, диапазон голоса – дыяпазон голасу,

**Заданне 5**.

А4, Б1, В5, Г2, Д3 **Максімальная колькасць балаў – 5б.**

**Заданне 6**. 1, 3, 5. **Максімальная колькасць балаў – 3б.**

**Заданне 7.** 1, 2, 4, 7. **Максімальная колькасць балаў – 4б.**

**Заданне 8. Максімальная колькасць балаў – 4б.**

Лемантар – буквар, сеча – бітва, ланіта – шчака, нагалосак – націск, чало – лоб, вакацыі – канікулы, чада – дзіця, перст – палец.

**Заданне 9.** А 3 Б 1 В 5 Г 2 Д 4 **Максімальная колькасць балаў – 5.**

**Заданне 10.** **Максімальная колькасць- 3б**

Уладзімір Караткевіч
Дамавік
Студзень

**Адказы 7 клас**
**Максімальная колькасць балаў за ўсе заданні - 34 б. =100%**

**Заданне 1. Максімальная колькасць балаў – 3б**

а) прыбраны, г) засеяны, е) сарваны

**Заданне 2. Максімальная колькасць балаў – 2 балы; 1 сказ – 1 бал**

а) Слухаючы прамову, узнікаюць недарэчныя думкі.
в)Бацька з сынам, спакойна размаўляўшы, селі за стол.

**Заданне 3. Максімальная колькасць балаў – 2 балы; 1 прыклад – 0.5 бал**

Цеплаход з 725 ( пасажыр) – сямюстамі дваццаццю пяццю пасажырамі,
Ад 896 адняць 287- васьмісот дзевяноста шасці адняць дзвесце восемдзесят сем, для 539 (школьнік)- пяцісот трыццаці дзевяці школьнікаў, 50 (год) юбілей – пяцідзесяцігадовы юбілей.

**Заданне 4. Максімальная колькасць балаў –2 балы; 1 правільны адказ – 0,5 б.**

Горадам Рагачовам, пісьменнікам Лужаніным, горадам Шчучынам, паэтам Куляшовым.

**Заданне 5. Максімальная колькасць - 5 балаў; 1 слова – 1 б.**

С-пако-ем, сон-ейк-а, май-ск-ае, радас-н-а, соч-ыць.

**Заданне 6. Максімальная колькасць – 5 б. ( За правільнае тлумачэнне 1 фразеалагізма -0,5 б; За 1 прыдуманы сказ – 1 б).**

Кляваць носам – драмаць, чытаць натацыю – павучаць, зарубіць на носе – запомніць, блытацца пад нагамі – перашкаджаць, будаваць паветраныя замкі – марыць, выкідваць штукі – сваволіць.

**Заданне 7. Максімальная колькасць балаў – 3 б. (1 словазлучэнне – 0,5 б.)**

Дзякаваць сябру, старэйшы за брата, схадзіць па хлеб, ажаніцца з каханай, кпіць з суседа, хварэць на грып.

**Заданне 8.** Максімальная колькасць балаў – 3 б. (1 слова – 0,5 б.)

[С’ц’эшка] , [Б’ашумна], [маладз’ба ], [гарацк’і ] , [ус’м’іхай’эца] , [л’й’э].

**Заданне 9. Максімальная колькасць балаў – 5 б. (За правільна вызначаны стыль -1б. , тып – 1 б.; за правільна расстаўленыя знакі прыпынку – 3 б.)**

На шырокай паляне, акружанай з трох бакоў лесам, маляўнічым парадкам стаяла шэсць хат. Самая крайняя ад поля хата была новая і нясканчаная. Спарыш і трыпутнік буялі навокал гэтай неабжытай будыніны. Гэтая расліннасць, мокрая і прыціснутая восеньскім холадам, усё яшчэ гусцілася і ўпарта зеляненела. Ганка пры новай хаце з забітымі вокнамі таксама не было.Парог у сенцы быў высокі, падмуроўка была зроблена з роўна складзенага вялікага камення, замацаванага цэментам і абсыпанага жвірам. ( Апісанне, мастацкі стыль).

**Заданне10.** А 2 Б 3 В 4 Г 1

**Максімальная колькасць балаў -4 б.**

**1 правільны адказ – 1 б.**

## Адказы 8 клас

## Максімальная колькасць балаў за ўсе заданні - 62 б. =100%

**1.** Людскі, сядзьце, сшыць, роўнядзь, ад'язджаць, мільярд, ззянне, каўказскі, з'есці, резерв, дзьмуць, лью

**Максімальная колькасць балаў -12б.**

**1 правільны адказ – 1 б.**

**2.**Блытаніна, наспех, упрысядкі, цэмент, супавы, пурпур, выпадак, дасыта

**Максімальная колькасць балаў- 4 б.**

**3.**Пайсці ў грыбы, хворы на грып, паўтары нормы, ліпа вышэйшая за бярозу, малады сяржант Свірыдава, дзве жанчыны, тры сёмыя, ажыны смачнейшыя за маліны, высокія каноплі, гуляць па лесе, бачыць на ўласныя вочы, нібы з гусі вада, дыму без агню не бывае

**Максімальная колькасць балаў- 6,5 б.**

**4.**Арышт, цырымонія, жэстыкуляцыя, пʹедэстал, антрэсоль, почырк, выкрасліць, восемсот, мілагучны, сувенір, шарсцяны, абарыген, рэдкалессе, радкаваты, мотакрос

**Максімальная колькасць балаў- 7,5 б.**

**5.**
1) хутка, паспешліва;
2) хутка, скора;
3) вельмі многа;
4) насуперак;
5) крыху, вельмі мала;
6) вельмі хутка;
7) вельмі моцна;
8) павольна;
9) нядрэнна, някепска;
10)даслоўна;

**Максімальная колькасць балаў- 10 б.**

**6.** а, б, г, д, е, к

**Максімальная колькасць балаў- 5 б.**

**7.** Брусника – брусніцы Боярышник - глог
Земляника - суніцы Смородина - парэчкі
Клюква - журавіны Черника - чарніцы

**Максімальная колькасць балаў- 6 б.**

**8.** 1, 2, 3, 5

**Максімальная колькасць балаў- 3 б.**

**9.**

| Псеўданім | Імя і прозвішча пісьменніка |
|---|---|
| *Янка Купала* | *Іван Луцэвіч* |
| *Якуб Колас* | *Канстанцін Міцкевіч* |
| *Кандрат Крапіва* | *Кандрат Атраховіч* |
| *Цётка* | *Алаіза Пашкевіч* |

**Максімальная колькасць балаў- 4 б.**

**10.** 1г, 2в, 3б, 4а.

**Максімальная колькасць балаў- 4 б.**